# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

БАЦЬКАЎШЧЫНА

№4 (287)

красавік 2026

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету "Бацькаўшчына"

**У НУМАРЫ:**

## Крыж "Змагарам за вольную і незалежную Беларусь" у Гданьску

Адкрывалі яго 21 сакавіка ў першы дзень каляндарнай вясны, перад Днём Волі 25 сакавіка. Ідэя паставіць крыж нарадзілася падчас святкавання сотых угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі, зладжаным Беларускім Культурным Таварыствам "Хатка".

Старонка 7

## Ансамбль "Купалінка" выступіў з дабрачынным канцэртам у Кумбулях

6 сакавіка, напярэдадні Міжнароднага жаночага дня, ансамбль беларускай народнай песні "Купалінка" Даўгаўпілскага Цэнтра нацыянальных культур падарыў дабрачынны канцэрт "Вясновыя мелодыі" падапечным цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Senioru rezidence ў Кумбулях.

Старонка 3

НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ



# ІВОНКА СУРВІЛЛА АДЗНАЧАЕ 90-ГОДДЗЕ

"Беларусь вызваліцца і стане нармальнай еўрапейскай краінай. Краінай дэмакратычнай, якая будзе шанаваць сваю беларускасць, якая будзе развіваць сваю культуру, свой дабрабыт, – кажа старшыня Рады БНР у інтэрв'ю з нагоды свайго юбілею.

11 красавіка старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла адзначае 90-годдзе. Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" сардэчна віншуе спадарыню Івонку з Днём народзінаў. Напярэдадні юбілею распыталі слынную беларускую дзяячку пра тое, у чым сакрэт яе бадзёрасці ў такім паважаным узросце, з чым звязаныя яе дзіцячыя успаміны пра Беларусь, пра што шкадуе і чаго яна жадае беларусам.

– Настрой? Ведаеце, даволі прыемны. Я нават і не спадзявалася атрымаць столькі цудоўнага з усіх бакоў, прыязнасці, любові… Усе захапляюцца маёй бадзёрасцю – гэта самае прыемнае (смяецца). Буду святкаваць – і святкаваць вельмі прыгожа.

У нядзелю, 12 красавіка, пройдзе прэзентацыя маёй кнігі, перакладзенай на беларускую мову, якую вязе сюды Сяргей Падсасонны.

Працяг на старонцы 4.

навіны

# БЕЛАРУСКІ РАМАН СТАЎ ХІТОМ У ЛІТВЕ: ПЕРАКЛАДЧЫЦА КНІГІ ЕВЫ ВЕЖНАВЕЦ АТРЫМАЛА ПРЭСТЫЖНУЮ ПРЭМІЮ

Саюз перакладчыкаў Літвы (LLVS) абвясціў лаўрэатку прэміі імя Дамінікаса Урбаса за 2026 год. Ёй стала паэтка і перакладчыца Юргіта Яспаніце-Буракене за пераклад рамана Евы Вежнавец "Па што ідзеш, воўча?" („Ko ateini, vilke?").

Кніга, якая ўжо паспела стаць знакавай для сучаснай беларускай літаратуры, цяпер афіцыйна прызнана культурнай падзеяй і ў Літве.

За што прысуджана ўзнагарода?

Камісія прэміі адзначыла надзвычайную складанасць працы з арыгіналам і высокі ўзровень выніку. Згодна з рашэннем Саюза перакладчыкаў Літвы, узнагарода прысуджана:

"За выдатна і плаўна перакладзены з беларускай мовы вельмі сакавіты, густы тэкст, за майстэрскае адлюстраванне культурных і гістарычных рэалій, прымавак, народнай мудрасці, за старанна адабраныя дыялектызмы, фальклорныя адценні і тэрміналогію, якая адлюстроўвае апісаны перыяд – міфічнае і гістарычнае светаўспрыманне рамана, – пры гэтым захоўваючы ўнікальны голас пісьменніцы Евы Вежнавец; а таксама за нататкі перакладчыцы, якія дапамагаюць чытачу пазнаць звычаі беларускага народа, міфічныя вобразы і рэаліі савецкага часу".



Юргіта Яспаніце-Буракене

Юргіта Яспаніце – вядомая літоўская паэтка, аўтарка трох паэтычных кніг; яна працуе з украінскай, беларускай і рускай мовамі. Да гэтага часу Юргіта была вядомая пераважна як перакладчыца паэзіі. Раман Евы Вежнавец стаў яе паспяховым дэбютам у перакладзе буйной беларускай прозы. Таксама яна займаецца перакладам міфічных тэкстаў народаў Сібіры і Далёкага Усходу.

Прэмія імя Дамінікаса Урбаса – адна з самых значных узнагарод у галіне перакладу ў Літве. Яна была заснавана ў гонар выдатнага літоўскага рэдактара, перакладчыка і лексікографа Дамінікаса Урбаса. Узнагарода традыцыйна ўручаецца за найлепшы пераклад мастацкай літаратуры на літоўскую мову, вызначаючыся высокімі патрабаваннямі да захавання стылістыкі і духу арыгіналу.

reform.news

тэатр

## БЕЛАРУСКІ СВАБОДНЫ ТЭАТР І КАЦЯРЫНА СНЫЦІНА АТРЫМАЛІ БРЫТАНСКІ ТЭАТРАЛЬНЫ ПРЫЗ OFFIES 2026 ГОДА

Сярод пераможцаў брытанскай тэатральнай прэміі Offies 2026 былі абвешчаны Беларускі Свабодны тэатр і Кацярына Сныціна, якія атрымалі прыз у намінацыі "Creation" за спектакль "KS6: Small Forward". Пра гэта паведаміў рэжысёр спектакля Мікалай Халезін.

"Сімвалічна, што гэта падзея адбылася 30 сакавіка, у дзень, калі тэатру споўніўся 21 год", – напісаў Халезін. Цырымонія ўзнагароджання прайшла ў Цэнтральнай зале ў Вэстмінстэры.

Прэмія Offies падтрымлівае творчасць, амбіцыі і ўстойлівасць незалежнага тэатральнага сектара. Сёлета было адзначана больш за 30 пастановак уручэннем больш за 50 узнагарод у дзесяці галінах.

Нагадаем, што паказы спектакля Беларускага свабоднага тэатра "KS6: Лёгкі форвард" ("KS6: Small Forward") з Кацярынай Сныцінай адбываліся на сцэне лонданскага тэатра Barbican (прэм'ера прайшла ў нью-ёркскім Тэатры La Ma Ma ў 2024 годзе). Пастаноўка Мікалая Халезіна і Наталлі Каляды заснаваная на гутарках з алімпійскай спартоўкай Кацярынай Сныцінай, якая выступіла супраць дыктатуры Аляксандра Лукашэнкі ў 2020 годзе.


Сцэна са спектакля. Каця Сныціна

reform.news

## ДЭКАДА ДНЯ ВОЛІ Ў БЕЛАСТОКУ ЗАВЯРШЫЛАСЯ СПЕКТАКЛЕМ

Паказам спектакля "Мая мама ў турме" ў Падляшскай бібліятэцы імя Лукаша Гурніцкага 31 сакавіка завяршылі дэкаду адзначэння Дня Волі ў Беластоку. Пастаноўка па кнізе Вольгі Вялічкі "Мая мама ў турме. Ад двух да пятнаццаці" была арганізаваная беларускім тэатрам з Вільні "VARTA".

Пастаноўка спектакля "Мая мама ў турме" адбылася ў рамках адзначэння Дня Волі ў Беластоку, дзякуючы супрацы мясцовых уладаў, Падляшскай бібліятэкі і Фонду OKNO NA WSCHOD.

Юрась Дзяшук,
racyja.com



навіны

# АНСАМБЛЬ “КУПАЛІНКА” ВЫСТУПІЎ З ДАБРАЧЫННЫМ КАНЦЭРТАМ У КУМБУЛЯХ

6 сакавіка, напярэдадні Міжнароднага жаночага дня, ансамбль беларускай народнай песні “Купалінка” Даўгаўпілскага Цэнтра нацыянальных культур падарыў дабрачынны канцэрт “Вясновыя мелоды” падапечным цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Senioru rezidence ў Кумбулях.



Для творчых калектываў даўгаўпілскіх беларусаў дабрачынныя мерапрыемствы і выступленні перад жыхарамі Аўгшдаўгаўскага краю ўжо даўно сталі шчырай традыцыяй.

“Купалінка” (мастацкі кіраўнік Вячаслаў Пятроў) падрыхтавала насычаную праграму – прагучалі беларускія, латышскія і латгальскія народныя песні.

Гледачы з захапленнем слухалі вершы пра вясну і аўтарскія песні Анатоля Галера, а таксама атрымлівалі асалоду ад танцавальных нумароў у выкананні Тацццяны Галер.

Для ансамбля “Купалінка” такія сустрэчы – гэта магчымасць падзяліцца душэўным цяплом і падтрымаць усіх, хто больш за ўсё мае такую патрэбу.

**Цэнтр нацыянальных культур муніцыпальнай установы “Даўгаўпілскі Палац культуры”**

# БЕЛАРУСЫ ВАРШАВЫ ЗЛАДЗІЛІ ЧАРГОВУЮ АКЦЫЮ

12 красавіка, у дзень праваслаўнага Вялікадня, беларусы выйшлі на акцыю ў цэнтр Варшавы. Арганізатар акцыі Васіль Плешкуноў павіншаваў беларусаў з Уваскрашэннем Хрыстовым. Дэманстранты правялі паралель гэта азначае і надзею на ўваскрашэнне беларускай нацыі.



Але галоўным у прамоўцаў было абмеркаванне бягучай сітуацыі ў Беларусі. Было адзначана, што рэпрэсіі ў Беларусі не сціхаюць. Дайшло да таго, што арыштоўваюць ужо цэлымі працоўнымі калектывамі – так сталася ў архітэктурнай студыі ZROBIM architects. І гэта толькі за запіс у сацсетках кіраўніка фірмы, што яму навязваюць дзяржаўнага ідэолага.

Таксама прагучалі абуральныя выступы па факту закрыцця трох грэка-каталіцкіх парафій на Берасцейшчыне: Берасцейскай, Баранавіцкай і Івацэвіцкай. Гэты факт, як сказаў грэка-каталіцкі вернік Вячаслаў Сіўчык, які ў 90-я дапамагаў узнаўляць Уніяцкую царкву ў Беларусі, гаворыць пра знішчэнне Беларусі па загаду Крамля праз найбольш нацыянальна арыентаваных духоўных месцаў сустрэч беларускіх вернікаў. Паводле грэка-каталіка з Берасця Аляксея, гэта помста ім за тое, што вернікі разам з святарамі падтрымалі публічныя акцыя за справядлівыя выбары ў 2020-м.

Скончылася акцыя традыцыйным агульным здымкам.

**brestspring.org**

БНР

# ІВОНКА СУРВІЛЛА АДЗНАЧАЕ 90-ГОДДЗЕ

Працяг са старонкі 1.

Сёння будзе вячэра з найбліжэйшымі беларусамі тут, а ў нядзелю вялікае святкаванне – прыедуць беларусы з іншых канцоў Канады. Тут вялізныя адлегласці, я вельмі ўдзячная, што людзі ў такія падарожжы выпраўляюцца, каб адзначыць маё свята.

Так што я вельмі цешуся сёння, ведаеце, вельмі прыемна, калі адчуваеш столькі сяброў вакол сябе, столькі любові, столькі надзвычайных эмоцый. Вялікі дзень у маім жыцці – 90 гадоў усё ж такі вялікі век, праўда?

**– Вы сказалі пра бадзёрасць, якой усе захапляюцца. Пры гэтым працуеце, узначальваеце Раду БНР ад 1997 году, сочыце за беларускім парадкам дня і ўдзельнічаеце ў ім. У чым сакрэт?**

– Шмат сакрэтаў не маю. У вялікай меры мне гэта перадалося ад бацькоў – гены любові да Беларусі. І я ўсё жыццё гэтым жыла. 82 гады на чужыне ўсё ж такі шмат, праўда? Але мы захавалі і мову, і любоў да Беларусі. Так што гэта як бы такі падарунак майму жыццю. Я маю Бацькаўшчыну, якую ніколі не траціла. І хаця была далёка, хаця па ёй тужыла ўсё жыццё, але і любіла ўсё жыццё, і заўсёды чулася беларускаю, адчувала гэтую прыналежнасць да беларускай зямлі. І гэта мне шмат памагала ў жыцці.

**– Вы пакінулі Беларусь у восем год. Фундамент вашай беларускасці – гэта сямейнае выхаванне?**

– Так, абсалютна. Я і мой брат выхоўваліся ў сапраўды беларускай сям'і і засталіся на ўсё жыццё беларусамі. У нашай сям'і ніколі не гаварылася на іншай мове, як па-беларуску. Мы прыехалі ў Данію, былі ў бежанскім лагеры. Але нават там тата кожную раніцу даваў мне і брату лекцыі па-беларуску па гісторыі і матэматыцы. Мне было дзевяць, браціку – восем, але мы ўжо пісалі пабеларуску і чыталі па-беларуску. Кнігі нам прывёз спадар Абрамчык (Мікола Абрамчык – беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, публіцыст, інжынер. Прэзідэнт Рады БНР ад 1947-га па 1970 год – Р.С.). Дзве кнігі толькі, дзе знойдзеш больш… "Сымон-музыка" Якуба Коласа і зборнік вершаў Ларысы Геніюш. Чыталі іх з братам услых. Памятаю, чытаю "Сымона-музыку" і пачынаю плакаць, тады перадавала кнігу браціку, то ён ужо чытае, пакуль не пачне сам плакаць. І мы так, плачучы, перачытвалі ўсю кнігу, уяўляеце?

Так што Беларусь была часткай нашага жыцця заўсёды. Нават не прыйшло б у галаву ўважаць сябе за іншых.

**– У адным з інтэрв'ю вы назвалі сябе голасам Беларусі. Што мелі на ўвазе?**

– Гэта вельмі важнае пытанне.

Свет не ведаў пра нас, беларусаў, бо маскоўская палітыка хавала Беларусь, каб лягчэй было праглынуць. І нам трэба было ўвесь час змагацца, каб неяк паставіць Беларусь на мапу свету.

Памятаю, былі такія нормы ISO (International Organization for Standardization, створаная ў 1947 годзе – Р.С.). І неяк трапіла мне ў рукі кніга па мовах свету, дзе кожная мова была напісаная мовай той краіны, адкуль яна паходзіла, у арыгінале. Французская – le français і гэтак далей. Беларуская ж мова нават не была пабеларуску названая, было там: белорусский язык.

І мяне гэта так уразіла, збянтэжыла, узрушыла, што я пайшла да свайго кіраўніка – а тады я працавала у Міністэрстве ўнутраных справаў Канады. Занесла свайму дырэктару стос папераў, доказаў пра існаванне беларускай мовы. Ён, на шчасце, меў сябра, які прадстаўляў Канаду ў гэтай International Organization for Standardization. І тады, нарэшце, яны пачалі пісаць у дакументах "беларуская мова". Падкрэслю, дзякуючы нам, беларусам у замежжы, а не дзякуючы Менску.

І такую працу мы рабілі праз усе гэтыя гады, а, як вядома, рада БНР у замежжы існуе ўжо 106 гадоў. І ўвесь гэты час мы змагаліся за Беларусь, за беларускую незалежнасць і за тое, каб людзі ў свеце ведалі пра Беларусь. Дык ці гэта не было голасам Беларусі тады, калі беларускі народ не меў права на голас?

**– Цяжкая праца. Але ж яна мела і вынікі – Беларусь цяпер не такая белая пляма на сусветнай мапе.**

– Ад 2020 году дакладна не белая пляма. Свет звяртае ўвагу на тое, што робіцца ў Беларусі ад таго часу, калі беларусы паказалі сябе на вуліцах з беларускімі сцягамі, паказалі, што хочуць волі і незалежнасці. І велізарную працу робіць Святлана Ціханоўская сваёй прысутнасцю ўсюды, дзе можна сказаць, што Беларусь існуе, што Беларусь не вое супраць Украіны. Яна расказвае не толькі пра нашых вязняў – кажа пра ўсё беларускае, пра культуру, пра народ. Яна ўсе гэтыя гады робіць тую працу, якую некалі рабілі толькі мы. Святлана, яе каманда, працягвае гэтае нашае змаганне за Беларусь. Можна сказаць, цяпер мы разам робім гэтую працу.

**– Вы рэгулярна з ёй у кантакце?**

– Так. Вось учора мне званіла, было вельмі прыемна пачуць віншаванні.

**– Але ж вы ведаеце, напэўна, што зараз у беларускай эміграцыі шмат спрэчак, сварак, абвінавачанняў – відавочных перамог, якіх хацелася б, няма, шмат расчараванняў і гэтак далей?**



Івонка з бацькамі і братам, 1946 год



Івонка і Янка Сурвіллы з дзецьмі, Мадрыд, 1964 год

– Я якраз хацела сказаць і пра гэта. Пра пачуццё нацыянальнай еднасці, якога, мне здаецца, так не хапае беларусам. Ведаеце, у той час, калі існуе такая небяспека для нашага народу ад постімперскіх намераў Расеі, калі мы ўсе мусім змагацца за наш край, бачыць, як людзі сварацца між сабой, – гэта мне вельмі баліць.

Мы цяпер мусім быць з'яднаныя як ніколі, каб змагацца супраць ворагаў, каб падтрымліваць адно аднога.

Тым больш, што ў Беларусі пачаўся новы наступ русіфікацыі. І найгорш, што беларусы, якія маглі б у Беларусі неяк старацца захаваць сваю беларускасць, сваю мову, сваё у школах, старацца, каб беларускасць была больш прысутная, не робяць гэтага. Але людзі, напэўна, баяцца і думаюць, як бы толькі перажыць гэтыя часы. А калі думаеш толькі пра тое, "як перажыць", то не застаецца месца на вышэйшыя каштоўнасці, вышэйшыя ідэалы. Гэта цалкам зразумела, канечне. Натуральна, што ў людзях страх пасяліўся.

Але застаюцца рэчы, якія нават нягледзячы на страх можна было б рабіць між сабою, хаця б гаварыць па-беларуску. Чаму гэтага не робяць? Чаму нават гэтага не разумеюць? Не разумеюць, што змянілі падручнікі беларускія ў Беларусі на расейскія, што гісторыя ім выкладаецца расейская, што робіцца гэты захоп, фактычна робіцца пакрысе поўная акупацыя Беларусі. Кожны ж можа ў межах сваёй сям'і нешта рабіць. Вось глядзіце, мае бацькі на чужыне мяне выхоўвалі, я сама ў пяці краінах жыла. Але ж я і на чужыне гаварыла і гавару па-беларуску, а ў Беларусі людзі не могуць гаварыць па-беларуску… Прыкра. Зразумела, што нават проста гаварэнне на беларускай мове ўладай можа адчувацца як нейкая небяспека для сябе, але ж, думаю, мусіць быць спосаб усё ж такі захаваць сваю беларускасць у душы. Спадзяюся, што беларускасць захаваецца.

**– Ці памятаеце Беларусь вашага дзяцінства?**

– Канечне, я заўсёды мела добрую памяць, так што вельмі добра памятаю. Другая сусветная пачалася, як мне было тры гады.

Саветы вельмі хутка пасля гэтага арыштавалі тату, ён працаваў намеснікам начальніка электрастанцыі чыгуначнай станцыі Баранавічы-Цэнтральныя. Памятаю слёзы мамы, яна плакала кожны дзень, кожны

дзень старалася неяк даказаць, што ён не вінаваты. Не разумелі ж мы тады яшчэ, што такое Саветы.

Пасля арышту таты мама выехала з намі ў Засулле пад Стоўбцамі да маіх дзядоў з боку таты. Гэта адзіны час майго дзяцінства, які я ўзгадваю з адной толькі прыемнасцю. Як мая бабуля мяне клікала раніцай на бліны са смятанаю, як дзед нам на печцы расказваў казкі, як раніцай чула пеўніка, што спяваў проста пад вокнамі. І памятаю, як выглядалі яблыні ў кветках.

Але, апрача гэта часу ў Засуллі, астатнія ўспаміны – вайна. Калі мы ўжо вярнуліся ў Баранавічы, пачаліся бамбаванні. Ніколі я пасля Засулля не ведала дзяцінства – аж пакуль не даехалі да Даніі ў 1944-м. Дарэчы, вось гэтую кнігу, што будзем прэзентаваць, я напісала праз 20 гадоў пасля вайны, таму што не магла пра гэта нават думаць, успамінаць. Калі пачынала ўспамінаць, то спаць не магла.

Шлях ад Баранавічаў да Даніі заняў 10 месяцаў. Гэта было штосьці страшнае, сапраўды страшнае. На кожным кроку я, дзіця, адчувала, што можам загінуць. Без тых цудаў, якія з намі тады невядома чаму здарыліся і якія цяжка сабе ўявіць, мы б туды не дабраліся. І толькі ў Даніі ў мяне з'явіліся сябры дзяцінства. Дацкія людзі – вельмі добры, цудоўны народ. Я там сябе нарэшце як дома, пайшла ў школу, хутка навучылася праз сяброў дацкай мове. Але пасля мусілі ехаць далей, бо Данія не магла ўтрымаць тыя сотні тысяч бежанцаў.

Выехалі ў Францыю. Як жартаваў тата, каб можна было змагчы пешкі ў Беларусь вярнуцца. Тамака я ўжо жыла 11 гадоў, пакуль не скончыла навукі. Але напачатку з французамі прыйшлося цяжка.

**– Чаму?**

– Па-першае, я ўжо ведала дацкую і ўжо была вытрымала экзамен у сярэднюю школу. А ў Францыі трэба было зноў распачынаць у пачатковай, каб авалодаць французскай. І дзеці французскія не такія ветлівыя да мяне былі. Вось навучылі мяне дрэнным французскім словам, а потым смяяліся, калі я іх гаварыла, думаючы, што яны не дрэнныя (смяецца). Карацей, страшэнныя часы для мяне былі напачатку ў Францыі.

Але пасля навучылася мове, палюбіла французскую культуру. Францыя мае вельмі шмат таго, што можа даць свету.

Пасля я 10 гадоў з мужам жыла ў Гішпаніі. Мы з Янкам рабілі беларускія радыёперадачы. Пасля закрыцця радыё знайшлася магчымасць пераехаць у Канаду, але гэта ўжо было не бежанства, а праз конкурс, экзамены. Канада аплаціла дарогу, прыняла нас.



Івонка Сурвілла ў Фондзе «Дзеці Чарнобыля»

А ў Канадзе ўжо працягвалі рабіць, што маглі, для беларускай справы. Чарнобыльскі фонд і розныя іншыя рэчы. Сем гадоў, пакуль мяне не выбралі старшынёй Рады БНР, я днём і ноччу займалася Чарнобыльскім фондам. За гэты час без аднаго цэнту дапамогі ад ураду прывезлі 5500 беларускіх дзетак на аздараўленне і лячэнне ў Канаду – усё праз прыватныя зборы.

**– Вы ж тады якраз і наведалі Беларусь?**

– Так, Генадзь Грушавы запрасіў нас у 1992 годзе на канферэнцыю "Свет пасля Чарнобыля". Як самалёт прызямляўся ў Менску, дык гэта быў адзін з найбольш шчаслівых момантаў майго жыцця.

А на канферэнцыі напаткала расчараванне, бо ўсё гаварылася па-расейску. Мне даводзілася слухаць выступы ў перакладзе на ангельскую, бо не разумела расейскай, я ж у расейскай школе ніколі не вучылася. Так што канферэнцыя мяне гэтым расчаравала, але людзі там былі цудоўныя. Прынялі надзвычайна, усё паказалі, што маглі паказаць.

Звазілі нас і ў Засулле, дзе я была маленькай, і на Смаргоншчыну, адкуль паходзіў Янка, мой муж. За 12 дзён тады назбірала ўспамінаў, якімі дагэтуль жыву.

**– Пэўна, у Засуллі ўжо мала што нагадвала тую Беларусь, якую вы памяталі?**

– Дык і я ж за гэты час шмат чаго перажыла і шмат што бачыла, да таго ж, ведала таксама пра ўсё, што рабілася ў Савецкім Саюзе. Радасць ад паездкі ў Беларусь ужо сама па сабе была радасцю. Таго Засулля, што я памятала пяцігадовай, безумоўна, ужо не было і не магло быць. Але людзі былі такія самыя. Хата дзядаўская, дарэчы, яшчэ стаяла, але там ужо жыў нейкі працаўнік мясцовага калгасу. Але атрымалася пабачыць цёцю з боку бацькі і цёцю з боку мамы, родных сясцёр таты і мамы.

Прывезла з Беларусі цэлыя куфары ўспамінаў. Для мяне было найбольш важна тады, што Беларусь стала вольнай. Была надзея, што ўсё зменіцца на лепшае. Адзінае, чым я тады моцна перажмалася, гэта Чарнобыль. Я вельмі перажывала гэтую трагедыю. Былі страшэнныя выпадкі, цяжкія сустрэчы з маткамі хворых дзетак. Але мы дзеля гэтага працавалі. Каб дапамагчы ім, рабілі, што маглі.

**– Што вас спыніла ад вяртання ў Беларусь назаўсёды?**

– А ці ведаеце вы, што тады беларускаму эмігранту ў Беларусі нават не было дазволена купіць сабе хату? Мы былі беларусамі, але нас лічылі за чужынцаў. І гэта так балела, так моцна раніла сэрца – мы ж цэлае жыццё пражылі Беларуссю і для Беларусі! А нам не можна было адкупіць бацькаўскай хаты ў Беларусі. Як так?!

Беларусы ў эміграцыі штогод на 25 сакавіка гаварылі пра тое, што ўсе імперыі развальваюцца, разваліцца і гэта імперыя – і тады вернемся ў Беларусь. А як прыйшлося, то аказалася, што можам толькі ездзіць адведваць. Не можна было нават затрымацца там. А вось расейцы маглі здабываць у Беларусі нерухомасць. Толькі беларусам-эмігрантам было забаронена. Мы хацелі купіць сабе кавалачак зямлі і пабудаваць сабе штосьці там. Але не маглі гэтага зрабіць. Гэта цяжка ўявіць. Жах нейкі, праўда?

**– Ці ёсць у вас аптымістычнае бачанне беларускай будучыні?**

– Ведаеце, я не магла б жыць без надзеі і веры ў перамогу. Практычна адзінае, пра што я шкадую, гэта што магу не паспець пабачыць таго, як Беларусь вызваліцца і стане нармальнай еўрапейскай краінай. Краінай дэмакратычнай, краінай, якая будзе шанаваць сваю беларускасць, якая будзе развіваць сваю культуру, свой дабрабыт. Я думаю, што мы будзем не горшай краінай за Данію, а Данія для мяне – ідэальная краіна.

У кожнага ёсць магчымасць штосьці зрабіць для Беларусі. Мне было дадзена вялікае шчасце, калі (хоць і не хацела) я стала старшынёй Рады БНР. Але, паўтаруся, кожны чалавек можа зрабіць штосьці добрае для Беларусі. Хаця б, напрыклад, жыць так, каб пра кожнага беларуса ведалі, што беларус – гэта добры чалавек, а Беларусь – цудоўная краіна, якая на пэўны час папалася ў лапы нягоднікаў.

Адно з нашых няшчасцяў у гісторыі – тое, што мы ў 1918-м не мелі прыяцеляў на Захадзе, нідзе не мелі. Нас не было каму падтрымаць і бараніць. З-за гэтага, магчыма, не атрымалі таго жыццёва неабходнага прызнання ў свеце. Таму трэба старацца здабыць прыяцеляў, старацца, каб пра Беларусь ведалі, каб ведалі, што Беларусь – не агрэсар, а краіна, паняволеная здраднікам.

Жадаю ўсім беларусам шчасця, перамогі і вольнай незалежнай сваёй дзяржавы.

Рыгор Сапежынскі, budzma.org

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

музей

# ЯК АЛЕСЬ МАІСЕЕНКА ЎРАТАВАЎ КАЛЕКЦЫЮ БЕЛАРУСКІХ ЭКСПАНАТАЎ

Уратаваная калекцыя – беларускія экспанаты, сабраныя пасля вайны Юр'ем Попкам, эмігрантам той хвалі.

Сёння тое, што ўдалося выратаваць, ужо ў Вільні – у Беларускім музеі імя Луцкевіча.

Даць калекцыі другое жыццё ўдалося дзякуючы беларускай супольнасці ў Германіі. Ініцыятарам стаў Алесь Маісеенка – актывіст аб'яднання беларусаў RAZAM e.V.

Алесю 25 гадоў, ён працуе журналістам на розныя медыі, у розны час – на нямецкія, беларускія і ўкраінскія.

"Я нарадзіўся і вырас у Германіі, але мае бацькі з Беларусі. Яны былі актыўнымі ў 1990-я, удзельнічалі ў Беларускім народным фронце, збіралі подпісы за Зянона Пазняка. Таму мяне заўсёды цягнула да беларускай тэмы", – расказвае ён.

Алесь выдатна размаўляе па-беларуску. Кажа, што для яго бацькоў было вельмі важна, каб ён з дзяцінства хаця б разумеў беларускую мову.

"Бацька быў беларускамоўным, з маці раней па-расейску размаўляў, потым з ёй таксама перайшлі на беларускую. Пасля 2014 года, калі пачалася вайна на Данбасе, я пачаў больш цікавіцца гісторыяй Усходняй Еўропы. Менавіта тады палепшыў сваю беларускую мову", – згадвае наш суразмоўца.

Яшчэ школьнікам Алесь даведаўся пра прыватны беларускі музей у нямецкім горадзе Ляймен, які ў 1982 годзе ў сваім доме заснаваў эмігрант Юрый Попка. Дзесяцігоддзямі Попка збіраў кнігі, дакументы, фотаздымкі і прадметы беларускай культуры, ствараючы ўнікальную калекцыю беларускай дыяспары ў Еўропе. Дзякуючы падтрымцы іншага вядомага беларуса Барыса Кіта гэты музей нават стаў афіцыйнай славутасцю горада. Але пасля смерці Попкі музей закрыўся, а калекцыю разабралі.

### Музей, які "склалі ў скрыні"

Пасля смерці Попкі горад, які паводле дамовы павінен быў даглядаць музей, фактычна ад гэтай адказнасці ўхіліўся.

"Я напісаў ім у 2017 годзе, спытаў, ці можна наведаць музей. Мне адказалі: не, яго закрылі, бо не было наведвальнікаў. Усе экспанаты проста запакавалі ў скрыні і перадалі на склад", – згадвае Алесь.

Паводле тастаменту Попкі калекцыя заставалася ўласнасцю горада, і толькі незалежная Беларусь магла вырашаць яе лёс. Алесь прапаноўваў перавезці экспанаты ў іншыя музеі, у Вільню ці Лондан, але атрымаў адмову. Потым яшчэ адну. І на некалькі гадоў гісторыя проста замерла.



Алесь Маісеенка на акцыі ў Варшаве

Трэці раз ён напісаў ужо амаль без надзеі, хутчэй, "у пустэчу": хацеў хаця б паглядзець, што засталося ад калекцыі. І раптам атрымаў адказ: прыязджайце.

"Для мяне гэта было нечакана. Пасля дзвюх адмоў я ўжо не спадзяваўся, што яны пагодзяцца. Я нават не прасіў перадаць калекцыю – проста хацеў паглядзець, што там засталося", – кажа ён.

Як высветлілася, у горадзе змяніўся бургамістр – і рашэнне прынялі літаральна адным подпісам.

### Калекцыю шукалі па складах

Калі супрацоўнікі адміністрацыі пачалі шукаць калекцыю, высветлілася, што нават яны самі не ведаюць, дзе яна знаходзіцца.

"Рэчы захоўваліся ў розных памяшканнях. Іх літаральна шукалі для мяне", – расказвае Алесь.

Знайшлі не ўсё. Частка экспанатаў знікла. У адно з памяшканняў нехта ўварваўся, забраў некаторыя рэчы і разбіў вокны – і вада ад дажджоў пашкодзіла частку калекцыі.

"Калі параўноўваць фотаздымкі 2007 года і тое, што мы знайшлі, – розніца вялікая. Шмат чаго ўжо няма. І нават поўнага спісу таго, што павінна было захоўвацца ў калекцыі, не існавала", – адзначае Алесь.

### "Мы ратавалі тое, што яшчэ можна было ўратаваць"

А далей пачалася амаль ручная праца па разбіранні руінаў: шукаць, супастаўляць, пераправяраць і збіраць гісторыю літаральна па кавалках. Алесь дасылаў старыя фотаздымкі музея, каб супрацоўнікі маглі пазнаць экспанаты. У апошні момант знайшлі нават бюст самога Юрыя Попкі. Усё, што ўдалося сабраць, вывезлі ў Вільню.

"Мы з бацькам проста загрузілі машыну і адвезлі ўсё. Было б добра, вядома, каб гэтыя рэчы захоўваліся ў Германіі. Але для гэтага тут проста няма адпаведнай інфраструктуры – ні падобнага музея, ні спецыялістаў, якія маглі б гарантаваць належнае захаванне, апісанне і працу з экспанатамі", – кажа ён.

Калекцыю прыняў Беларускі музей імя Луцкевіча, дзе яе цяпер будуць прафесійна апісваць і захоўваць. Дапамаглі і іншыя: Фундацыя Крачэўскага ў ЗША пакрыла выдаткі на паліва, далучыліся і людзі з супольнасці "Разам" – у тым ліку тыя, хто дапамог даставіць асобныя экспанаты.

"Без іх гэта дакладна не атрымалася б", – прызнаецца Алесь.

Для Алеся гэтая гісторыя не толькі пра рэчы.

"Як беларус, які нарадзіўся ў Германіі, я вельмі цікаўлюся гісторыяй беларускай дыяспары. І гэта ўнікальная з'ява – фактычна адзіны такі музей, які існаваў тут".

Ёсць і асабістая сувязь: Алесь быў знаёмы з Барысам Кітом.

"Тое, што мы асабіста былі знаёмыя з Барысам Кітом, ездзілі да яго ў госці, таксама паўплывала на гэту ініцыятыву. Прыемна адчуваць, што мы ў нейкім сэнсе працягваем яго справу і змаглі выратаваць хаця б частку гэтай калекцыі – каб яна стала даступнай для іншых беларусаў, каб праз яе можна было вывучаць гісторыю Беларусі і беларускай дыяспары", – дадае Алесь.

### Ідэальны сцэнар – вяртанне ў Беларусь

Менавіта так хацеў Юрый Попка: у сваім тастаменце ён марыў, каб калекцыя калісьці апынулася ў незалежнай беларускай дзяржаве.

Пры гэтым спробы вярнуць калекцыю ў Беларусь ужо былі. У пачатку 1990-х тагачасны амбасадар Беларусі ў Нямеччыне Пётра Садоўскі цікавіўся магчымасцю перавезці яе на радзіму. Але пасля змены ўлады ў 1994 годзе гэтая ідэя не атрымала працягу.

"Мы спадзяёмся, што прыйдзе дзень, калі Беларусь стане вольнай, і гэтыя рэчы можна будзе перавезці туды. Магчыма, у Пружаны, адкуль родам Юрый Попка", – кажа Алесь.

Пакуль жа Вільня – геаграфічна найбліжэйшы да Беларусі пункт.

Паралельна супольнасць беларусаў у Германіі спрабуе рэалізаваць і іншыя культурныя ініцыятывы. Напрыклад, у Франкфурце хочуць усталяваць мемарыяльную дошку ў гонар Васіля Быкава – там ён жыў, як і Барыс Кіт, з якім яны былі знаёмыя.

"Мы падавалі гэтую ідэю гарадской радзе яшчэ ў верасні, але пакуль чакаем адказу. Нямецкая бюракратыя – гэта таксама выклік", – адзначае Алесь.

Тым не менш у "Разам" плануюць і далей займацца культурнымі праектамі: "Хочам, каб у Германіі лепш разумелі, што Беларусь – гэта не толькі пра палітыку, але і пра культуру, пра людзей і гісторыю".

nashaniva.com

крыж

# КРЫЖ “ЗМАГАРАМ ЗА ВОЛЬНУЮ І НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ” У ГДАНЬСКУ

Адкрывалі яго 21 сакавіка ў першы дзень каляндарнай вясны, перад Днём Волі 25 сакавіка. Ідэя паставіць крыж нарадзілася падчас святкавання сотых угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі, зладжаным Беларускім Культурным Таварыствам “Хатка”.



Тады, у 2018 годзе, яшчэ шматлюдна святкавалася ў Беларусі. Гэта натхніла нас на ўшанаванне памяці тых беларускіх змагароў, якія дасюль невядома дзе склалі свае косці. Незалежная Беларусь як быццам забыла пра сваіх герояў, дзякуючы якім яна змагла адрадзіцца і зайснаваць у свеце. Можа, не столькі забыла, колькі не знайшла іх магіл, бо ў энцыклапедыях і ў слоўніках яны існуюць з абарванымі лёсамі – “далейшы лёс невядомы”. А калі невядомыя лёсы, дык і магілы невядомыя…

Прыдумалі, што памяць герояў Беларусі належыць ушанаваць на старых гістарычных могілках ў Гданьску, найлепш у цэнтры горада – на Гарнізонных могілках, дзе ўжо знайшлі вечны спачын такія беларускія дзеячы, як мастак Кузьма Чурыла, Сэрафіна і Лука Дзекуць-Малеі, Ізыдар Пузырэўскі і памерлая два гады таму наша актывістка Ірына Гаданьчук-Гэрэлюк. Нашую ідэю падтрымаў тадышні прэзідэнт Гданьска Павал Адамовіч, якога бацька падчас вайны вучыўся ў Віленскай Беларускай Гімназіі. Пасля яго нечаканай трагічнай смерці нашая ініцыятыва заляжалася да 2021 года. Тады пад каменем Янкі Купалы ў Гданьску-Аліве 25 сакавіка з гэтай ідэяй звярнуліся мы да новай прэзідэнткі Гданьска Аляксандры Дулькевіч. Яна падтрымала нашую ініцыятыву і справу перадала Гданьскаму кіраванню дарог і зеляніны, якому падлягаюць могілкі. Там таксама сустрэліся з вялікай прыхільнасцю, асабліва з боку інспектара Анджэя Жэшатальскага, які яшчэ перад летам 2021 года вызначыў нам месца пад пастаноўку крыжа. Аднак каб яго паставіць, трэба было зрабіць архітэктурны праект і атрымаць згоду ваяводскага паморскага кансерватара славутасцяў, якім на той час быў Ігар Стжок.

За лета праект крыжа падрыхтаваў вядомы гданьскі архітэктар Станіслаў Шыманскі, зяць беларускага мастака Пятра Жынгеля, і сам з радаводам з усходняй Беларусі, дзе яго продкі яшчэ да Першай сусветнай вайны закладалі беларускія школы. Нягледзячы на не найлепшую славу ў грамадстве і кансерватар славутасцяў нечакана памысна аднёсся да нашай ініцыятывы.

Не пералічваючы колькасці папераў, якія спатрэбіліся, у маі 2023 года атрымалі мы пастанову на будову крыжа на Гарнізонных могілках – да канца жніўня 2025-га. Тады нам здавалася, што мы маем шмат часу на здзяйсненне нашых мараў. Аднак у жыцці не бывае так проста, як хацелася б. Праўда, амаль год нам заняло здабыццё пастановы на будову прэзідэнта горада Гданьска. А то кансерватар славутасцяў праз паўгода не выдаваў нам аштампаванага праекта крыжа, а то мы няўмела запаўнялі прафесійныя друкі ў аддзел урбаністыкі і архітэктуры гарадской управы, які нам адсылаў да праўкі паперы на працягу 7 дзён, якіх мы не былі ў стане ў так хуткім часе папоўніць і ўсё вярталася да пачатку – трэба было скласці новае прашэнне і г. д.

Толькі ў чэрвені 2024 года горад выдаў нам дазвол на будову крыжа і мы маглі пачаць дзейнічаць – знайсці муляра, які нам рэалізуе праект. Як ні шукалі, ніхто не хацеў узяцца за выкананне магутнага дубовага крыжа. У канцы згадзіўся зрабіць нам усё, апрача крыжа, – каменныя двухмоўныя таблiцы, пакласці гранітныя пліткі – Раман Лебрэхт з Тчэва. Засталося знайсці сталяра, які выканае чатырохметровы крыж. З падказкай дырэктара суполкі “Зеляніна” выканаць дубовы крыж згадзіўся Ян Асоўскі з Пінчына.

Калі мы ўвосень 2024 года хацелі распачаць працы на могілках, чакалі нас новыя неспадзяванкі – аказалася, што ў міжчассе квартал, у якім меўся стаяць крыж, быў перададзены гданьскай праваслаўнай парафіі, але пасля чарговага паўгода ўдалося дайсці да паразумення, каб крыж усё ж такі стаў на вызначаным тры гады раней месцы. Аднак аказалася, каб нешта рабіць на гістарычных могілках, павінен працу спярша правесці археолаг. А на тое зноў патрэбная згода кансерватара славутасцяў – вядома – куча папераў. На шчасце, кіраўнік будовы Завал Гронкоўскі знайшоў вельмі кампетэнтнага археолага Аляксандра Квапінскага, які бясплатна падрыхтаваў усю прафесійную дакументацыю, каб атрымаць згоду на раскопкі. Мы яе атрымалі толькі ў сярэдзіне жніўня 2025 года. Вядома, што будова крыжа не магла ў такім выпадку закончыцца да канца гэтага месяца. Прыйшлося зноў пісаць да кансерватара славутасцяў, каб працягнуць тэрмін будовы. Атрымалі, але гэта ўжо быў верасень 2025 года. Геадэзіст Марцін Гілля вымераў пляцоўку пад пабудову і пачаліся сур’ёзныя працы, якія закончыліся ў снежні. Мы не рызыкнулі, каб крыж адкрываць зімой. Вырашылі перанесці ўрачыстасці на першы дзень вясны.

Вядома, што наша ініцыятыва вымагала немалых фінансавых сродкаў, каб справу давесці да канца. А мы ж грамадская арганізацыя. Вырашылі звярнуцца да сумлення беларусаў, каб фінансава падтрымалі ініцыятыву. Водгук быў нечаканы – мы сабралі больш за 20 тысяч злотых ад канкрэтных ахвяравальнікаў. 20 тысяч злотых далі “Гданьскія аўтобусы і трамваі”.

Урэшце надышоў дзень адкрыцця крыжа – 21 сакавіка – з цудоўным сонечным надвор’ем. Здавалася, што так радуюцца нябёсы, што ўсё ж такі мы давялі справу да канца. Сабралася шмат беларусаў з бел-чырвона-белымі сцягамі, з кветкамі і знічкамі. Распачаў урачыста ігрой на дудзе Яўген Барышнікаў. Крыж адкрывалі Мацей Лісіцкі – дырэктар “Гданьскіх аўтобусаў і трамваяў”, еўрапейскі паэт свабоды Уладзімір Арлоў і ўнукі доктара Станіслава Грынкевіча – прафэсар Яцэк Вайткевіч і псіхолаг Яана Каханьская. Пасля я коратка прадставіла гісторыю крыжа і прачытала сімвалічны лік 100 асобаў, якія былі расстраляныя, загінулі ў лагерах і да сёння невяломыя іх магілы. Паколькі ў міжчассе памерлі ці былі закатаваныя таксама людзі пасля падзей 2020 года ў Беларусі або загінулі на вайне ва Украіне, зачытала таксама іхнія імёны. Затым паніхіду адправіў а. Дарафей Юзвік і асвяціў крыж. За палеглых беларусаў на беларускай мове маліўся кс. Пётр Врубэль, які таксама асвяціў крыж. Пастар з баптысцкай царквы Кандрат Грондыс прачытаў фрагмент Другога паслання Паўлы да Цімафея. Дзяўчыны, апранутыя ў беларускія народныя строі, праспявалі дзве народна-рэлігійныя песні.

Пазней выступіў Мацей Лісіцкі, які ўспомніў пра свайго дзеда, арыштаванага ў 1933 годзе ў БССР, які памёр у лагеры, пра сямейнікаў, якія дзейнічалі ў Беларускай Народнай Самапомачы падчас вайны, а пасля з’ехалі на захад. Уладзімір Арлоў сказаў пра герояў і змагароў за Беларусь на працягу стагоддзяў. Прадстаўнікі сем’яў палеглых – унукі доктара Станіслава Грынкевіча Яцэк Вайткевіч і Яанна Каханьская – успомнілі свайго дзеда.

Пасля прамоваў складалі кветкі і запальвалі знічкі. Намеснік старшыні БКТ “Хатка” Раман Шчэрбаў падзякаваў усім за прысутнасць, а ахвяравальнікам за грамадскі водгук на фінансавую падтрымку нашай ініцыятывы, кажучы: “Без вас гэтага крыжа не было б. Прыходзьце сюды, маліцеся, прыносьце кветкі і знічкі і памятайце пра нашых герояў”. На канец урачыстасці Яўген Барышнікаў зайграў на дудзе “Магутны Божа”.

У Аблыцкім цэнтры культуры і адукацыі ў гонар змагароў за Беларусь адбыўся вечар паэзіі і музыкі. Вершы чыталі Уладзімір Арлоў, Валянціна Аксак, Наста Кудасава і Андрэй Хадановіч, а музыку Вялікага Княства Літоўскага грала мультыфлейтыстка Мая Міро-Вісьнеўская.

На заканчэнне хочацца прыгадаць словы з успамінаў Веры Касмовіч: “Каму прыйдзецца чытаць мой горкі ўспамін, схіліце, калі ласка, нізканізка галаву ў гонар усіх пакутнікаў, якіх жыццё абарвалася заўчасна. Чыя б зямля іх не забрала, не прытуліла, сваёй Бацькаўшчыны ці чужой, хай яна ім будзе ўтульнай і ласкавай. Светлы вобраз нявінна памерлых патрыётаў павінен жыць і ўшаноўвацца. Вечная памяць усім ім!”

**Лена Глагоўская, czasopis.pl**

**спевы**

# СПЕЎНІК "МІЛЕЙШАЙ СЭРЦУ КРАІНЫ НЯ ЗНОЙДЗЕШ" – ВЫНІК 100-ГАДОВАЙ ПРАЦЫ БЕЛАРУСАЎ

У Варшаве перавыдалі спеўнік "Мілейшай сэрцу краіны ня знойдзеш. Зборнік беларускіх патрыятычных песень для хору".

Спеўнік "Мілейшай сэрцу краіны не знойдзеш. Зборнік беларускіх патрыятычных песень для хору" упершыню выйшаў у Нью-Ёрку ў 2006 годзе. Яго ўклаў дзеяч беларускай эміграцыі Кастусь Верабей. У кніжцы змешчаныя тэксты песень, якія спявалі беларусы ў эміграцыі. Аднак у зборніку не было нот, былі толькі словы, аўтарства якіх, да таго ж, не заўсёды дакладна вядомае.

Кастусь Верабей пісаў пра сябе: "Складальнік зборніка ня меў доступу да большасьці арыгінальных запісаў словаў і мэлёдыяў, надрукаваных у гэтым зборніку песьняў, а запісваў іх з памяці. З гэтае прычыны ў зборніку маглі здарыцца памылкі ў названьнях аўтараў словаў і музыкі, а таксама незнарочныя разыходжаньні паміж аўтарскімі арыгіналамі й надрукаванымі тэкстамі, за што складальнік перапрашае аўтараў твораў і сьпевакоў, што будуць карыстацца зборнікам" (тут і далей у цытатах захаваны арыгінальны правапіс – Рэд.).

Музыка і спявачка Тацццяна Грыневіч-Матафонава вырашыла зрабіць перавыданне зборніка, але ўжо з нотамі. На гэту працу спатрэбіўся цэлы год. Укладальніца тлумачыць: "Беларусы ў эміграцыі проста збіраліся і спявалі гэтыя песні так, як іх вывучылі ў свой час, напрыклад, у хорах, але не заўжды мелодыі былі запісаныя нотамі. Пра кампазітараў некаторых твораў вядома зусім мала. Ёсць і песні невядомых аўтараў".

Некаторыя песні са зборніка папулярныя і сёння: "Магутны Божа", "Не загаснуць зоркі ў небе", "Ваяцкі марш" (іх выконваў хор "Унія" пад кіраўніцтвам Кірылы Насаева). Частка мелодый ужо друкавалася раней і адносна даступная, але некаторыя Тацццяне давялося шукаць.

Напрыклад, ноты Антона Грыневіча на верш Янкі Купалы "Гэй, наперад" знайшліся ў "Беларускім календары" за 1923 год. Укладальніца кажа пра гэты твор: "Песня, якую ўсе любілі і спявалі амаль што як народную, праз сто год была забытая і, каб не запісаныя ноты, яе было б немагчыма аднавіць".

Некаторыя ноты Тацццяна сама наноў аранжавала для хору. Мелодыі твораў "Як шырока і далёка", "Нёман", "Я люблю густыя шумы", "Партызанскі марш" яна запісала з голасу Алы Орсы-Рамана, якая ў пасляваенны час спявала ў хорах Міколы Куліковіча і Міколы Равенскага ў нямецкім Рэгенсбургу, а цяпер жыве ў ЗША. У прадмове да выдання можна пачытаць вытрымкі з успамінаў спадарыні Алы:

"Пасьля вайны ў беларускім лягеры ў горадзе Рэгенсбургу была створана акрэдытаваная гімназія для дзяцей… Галоўным адказным за ўсе музычныя патрэбы ў гімназіі быў Мікола Куліковіч, ён жа кіраваў хорам гімназіі. Равенскі меў у лягеры свой асобны хор. Тады мы ўсе хадзілі і ў адзін, і ў другі хор…

Равенскі быў невысокі, кіраваў хорам спакойна, часам нешта расказваў, калі практыкаваліся, ужываў скрыпку, каб паказаць тон, паўтону вышэй. Пераважна сьпявалі беларуския народныя песні, і заўжды а капэля.

Куліковіч жа ўвесь час сядзеў за піяніна, калі нехта нешта зробіць, ён папраўляў, граючы на піяніна, даваў слухаць, дзе мы памылкі зрабілі. Сьпявалі песьні нацыянальна моцныя, адраджэнцкія, усе з акампаніментам Куліковіча.

Кожны тыдзень быў выступ у лягеры, нас прыходзілі слухаць украінцы, немцы, іншыя нацыянальнасьці. Часам мы езьдзілі з выступамі па іншых лягерох. Такім было патрыятычнае выхаваньне ад Куліковіча і Равенскага на ўсё далейшае жыцьцё".

У працы над укладаннем зборніка Тацццяне дапамагаў бард Сяржук Сокалаў-Воюш, канчатковую вычытку тэкстаў зрабіў Вінцук Вячорка, які прапанаваў невялікія праўкі, што больш адпавядаюць першакрыніцам.

У сваёй частцы прадмовы Сяржук Сокалаў-Воюш напісаў: "Працу, якую ў іншых краінах робяць цэлыя калектывы, Тацяна зрабіла адна. Мы, хто нешта дапамаглі, ДАПАМАГЛІ, БО ЯНА ЗРАБІЛА! як сказаў Вінцук Вячорка, "фантастычную, унікальную працу на вякі". І гэта праўда".

Сама ж Тацццяна адзначыла: "Гэты зборнік – вынік 100-гадовай працы беларусаў". Нават больш, чым стогадовай: у спеўнік увайшоў, напрыклад, верш Янкі Купалы "Не загаснуць зоркі ў небе", напісаны ў 1911 годзе і пакладзены на музыку Мікалаем Янчуком, "Ваяцкі марш (Мы выйдзем шчыльнымі радамі)", напісаны ў 1919-м Макарам Краўцовым, які стаў гімнам БНР з музыкай Уладзімера Тэраўскага.




Цікавая гісторыя варыянту верша "О Беларусь, мая шыпшына", змешчанага ў спеўніку. Да яго пазначана аўтарства Уладзіміра Дубоўкі і Ларысы Геніюш. У верш Дубоўкі ўстаўлена чатырохрадкоўе Геніюш, бо Тацццяна раней пачула такі варыянт песні ад сяброў, і ў такім выглядзе ўзяла яе ў свой рэпертуар. "Ларыса Геніюш у сваіх лістах пісала, што ў вершах Дубоўкі не хапае пратэсту, то праз дадаванне гэтага чатырохрадкоўя ў песню пратэст у ёй з'явіўся", – патлумачыла Тацццяна.

Укладальніца распавядае: "Агулам у зборніку 37 песень. Ён выйшаў у Варшаве накладам тысяча асобнікаў для таго, каб мы больш не забыліся на гэтыя песні, і каб праз яшчэ сто год яны шырока гучалі сярод беларусаў".

На вокладцы перавыдання – фотакопія вышыўкі, якую зрабіла ўкладальніца. Кожная песня суправаджаецца qr-кодам, па якім на youtube-канале Тацццяны Грыневіч-Матафонавай можна паслухаць, як твор гучыць у выкананні хору (усе партыі запісала сама спявачка, а некаторыя песні – з сынам Адасем Матафонавым). "У зборніку – ноты для хору, – тлумачыць укладальніца. – Але і адзін чалавек дома можа слухаць запісы на канале і, гледзячы ў ноты, падпяваць мелодыю".

Акрамя таго, на канале шмат іншых праектаў Тацццяны: беларускія калыханкі, забаўлянкі, музыка і майстар-класы па традыцыйных танцах, вершы беларускіх паэтаў у іх аўтарскай агучцы, турэцкія песні.

Спеўнік "Мілейшай сэрцу краіны ня знойдзеш. Зборнік беларускіх патрыятычны песень для хору" можна набыць у беларускіх крамах Варшавы ("Кнігаўка", "Вырай", kirma.sh), у тым ліку праз інтэрнэт.

**Алеся Лях, budzma.org**

## Беларускі каляндар памятных дат на травень 2026 года

**1 траўня**
• 145 гадоў таму, у 1881-м, нарадзіўся Янка Журба (сапр. Івашын), паэт. Памёр у 1964-м.
• 40 гадоў таму, у 1986-м, памёр Сцяпан Александровіч, літаратуразнавец.

**5 траўня**
• 195 гадоў таму, у 1831-м, нарадзіўся Уладзіслаў Борзабагаты, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Памёр у 1886-м.

**6 траўня**
• 265 гадоў таму, у 1761-м, нарадзіўся Станіслаў Юндзіл, даследчык раслінаў і жывёлаў Беларусі. Памёр у 1847-м.
• 100 гадоў таму, у 1926-м, памёр Казімір Сваяк (сапр. Канстанцін Стаповіч), каталіцкі святар, паэт.

**8 траўня**
• 130 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Антон Дамброўскі, філосаф, тэолаг. Памёр у 1947-м.

**10 траўня**
• 40 гадоў таму, у 1986-м, памёр Аляксандр Карповіч, выдавец.

**13 траўня**
• 105 гадоў таму, у 1921-м, нарадзіўся Аркадзь Качан, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Памёр у 1982-м.

**15 траўня**
• 90 гадоў таму, у 1936-м, нарадзіўся Барыс Сачанка, пісьменнік. Памёр у 1995-м.
• 55 гадоў таму, у 1971-м, у Лондане адкрылася Беларуская бібліятэка і музей імя Францыска Скарыны.

**16 траўня**
• 115 гадоў таму, у 1911-м, нарадзіўся Васіль Вітка (сапр. Цімох Крысько), дзіцячы пісьменнік. Памёр у 1996-м.

**17 траўня**
• 95 гадоў таму, у 1931-м, памёр мітрапаліт Мелхіседэк (Міхаіл Паеўскі).

**19 траўня**
• 130 гадоў таму, у 1896-м, памёр Ян Козел, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**23 траўня**
• 80 гадоў таму, у 1946-м, памёр Кастусь Езавітаў, гісторык.

**27 траўня**
• 35 гадоў таму, у 1991-м, створана Міжнародная асацыяцыя беларусістаў.

**28 траўня**
• 190 гадоў таму, у 1836-м, нарадзіўся Ян Карловіч, лінгвіст, этнограф, музыказнавец. Памёр у 1903-м.

**29 жніўня**
• 165 гадоў таму, у 1861-м, памёр Яўхім Лялевель, гісторык, ідэолаг паўстання 1830–1831 гг.

**30 траўня**
• 200 гадоў таму, у 1826-м, нарадзіўся Зыгмунт Сераkoўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Павешаны ў 1863-м.

**31 траўня**
• 30 гадоў таму, у 1996-м, у Іркуцку створана Таварыства беларускай культуры імя Івана Чэрскага.

**Беларусы ў свеце**
№ 4 (287), красавік 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар – Н. Шыдлоўская, А. Макоўская
Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com